УДК 616.8(091):378.4(476.6)

# ГІСТОРЫЯ МЕДЫКА-ПСІХАЛАГІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА ГРОДЗЕНСКАГА МЕДЫЦЫНСКАГА УНІВЕРСІТЭТА (да 15-годдзя заснавання)

*В.А. Карпюк, к.м.н., дацэнт; В.І. Варанец*

УА «Гродзенскі дзяржауны медыцынскі універсітэт»

*У пададзеным артыкуле акрэслены асноўныя этапы стварэння медыка-псіхалагічнага факультэта, названы асобы, якія стаялі ля вытокаў гэтай падзеі.*

***Ключавыя словы**: медыка-псіхалагічны факультэт, медыцынскі універсітэт, кафедра медыцынскай псіхалогіі і псіхатэрапіі, псіхіятрычная служба, медыцынскі псіхолаг.*

*The present article marks the cardinal foundation stages of the Faculty of Medical Psychology, and indicates the persons who initiated its foundation.*

***Key words**: Faculty of Medical Psychology, Medical University, Department of Medical Psychology and Psychotherapy, Mental Health Service, medical psychologist.*

Канец 80-х – пачатак 90-х гадоў мінулага стагоддзя, апроч рознага роду палітычных і эканамічных катаклізмаў, выплеснуў на паверхню нашага грамадства і неверагодную колькасць так званых наваяўленых “псіхатэрапеўтаў”. Іх з’яўленне не было нечаканым: развал некалі, здавалася, непахіснай дзяржавы, знішчэнне духоўных ідэалаў, страта эканамічнай стабільнасці – усё гэта моцна паўплывала на псіхіку звычайнага абывацеля. Што з поспехам і скарысталі рознага роду шарлатаны, актыўна пачаўшы з тэлеэкранаў, у вялікіх залах і на стадыёнах прадказваць будучыню, зараджаць ваду і аздараўляць “лячэбным” гіпнозам.

А вось сапраўдных, прафесійных псіхолагаў з медыцынскай адукацыяй у нашай краіне на той час практычна не было. Толькі Маскоўскі дзяржаўны універсітэт рыхтаваў практычных (ці клінічных) псіхолагаў. Але без медыцынскай адукацыі шлях да хворых ім быў закрыты. Такая сітуацыя не магла працягвацца доўга.

Першым за вырашэнне праблемы падрыхтоўкі прафесійных псіхолагаў на Беларусі ўзяўся Уладзімір Сямёнавіч Васільеў, які на той час займаў пасаду першага прарэктара ў Гродзенскім дзяржаўным медыцынскім інстытуце. Чалавек перадавых поглядаў, ён добра разумеў усю перспектыўнасць стварэння факультэта з псіхалагічным ухілам. Тым больш, што пэўныя напрацоўкі ў гэтай справе ўжо былі. Плённа працавала ў інстытуце кафедра псіхіятрыі, якую ўзначальваў Обухаў Генадзь Аляксеевіч. Менавіта пры гэтай кафедры быў створаны курс агульнай псіхалогіі, дзе пачыналі працаваць першыя выкладчыкі і навучацца першыя студэнты медыка-псіхалагічнага факультэта.

Калі Уладзімір Сямёнавіч звярнуўся ў Міністэрства аховы здароўя з абгрунтаванымі прапановамі аб адкрыцці медыка-псіхалагічнага факультэта, на дзіва, ён адразу ж знайшоў паразуменне сярод кіраўнікоў міністэрства. Вялікую ролю ў станоўчым вырашэнні пытання адыграла, безумоўна, Чарнобыльская трагедыя. Беларусы вельмі моцна адчулі яе наступствы, звязаныя з псіхасаматычнымі захворваннямі, шматлікімі стрэсамі. Таму грамадства адчувала вялікую патрэбу ў медыцынскіх псіхолагах, псіхатэрапеўтах, нарколагах.

У красавіку 1993 года было прынята рашэнне аб стварэнні медыка-псіхалагічнага факультэта. У гэтым жа годзе адбыўся і першы набор студэнтаў. Спачатку факультэт існаваў у якасці аддзялення пры педыятрычным факультэце, які з 1993 па1997 гады ўзначальваў Пяткевіч Міхал Міхайлавіч, а з 1997 па 1998 гг.– Генадзь Рыгоравіч Мармыш. У гэты ж час абылася яшчэ адна значная падзея ў станаўленні маладога факультэта. Творчая група аднадумцаў у асобе Карпюк Валянціны Аляксееўны, Мельнікава Андрэя Мікалаевіча, якую ўзначаліла прафесар Каралёва Алена Рыгораўна, пачала плённую работу па стварэнні кафедры медыцынскай псіхалогіі і псіхатэрапіі. Справа была досыць складанай, бо для фарміравання кафедры неабходны новыя праграмы і дысцыпліны: псіхасаматыка, патапсіхалогія, медыцынская псіхалогія, дэанталогія, нейрапсіхалогія і інш. Але ўпартая праца дала свой пазітыўны плён: у 1995 годзе ў Гродзенскім медыцынскім універсітэце адкрылася першая і адзіная сярод усіх медыцынскіх вну кафедра медыцынскай псіхалогіі і псіхатэрапіі. Лагічна, што і першай загадчыцай кафедры стала прафесар Каралёва Алена Рыгораўна. Паступова пачалі падбірацца новыя супрацоўнікі, якія праходзілі субардынатуру па псіхіятрыі, клінічную ардынатуру.

У 1998 годзе аддзяленне было ператворана ў самастойны факультэт. Першым дэканам медыка-псіхалагічнага факультэта стала Шамава Таццяна Міхайлаўна, якая паспяхова працавала на гэтай пасадзе да 2006 года.

Ужо з першых дзён існавання супрацоўнікі факультэта сутыкнуліся з шэрагам разнастайных праблем. Першапачаткова планавалася і выпускаліся не толькі ўрачы-псіхіятры, нарколагі і псіхатэрапеўты, але і так званыя ўрачы-псіхолагі. Менавіта апошнія і выклікалі цэлую хвалю спрэчак і сумненняў аб іх далейшым прафесійным выкарыстанні. І такія пытанні ставіліся менавіта класічнымі псіхолагамі, якія даводзілі, што ў псіхолагаў зусім іншае мысленне, іншы падыход да псіхалогіі чалавека і што спецыяліст з медыцынскім мысленнем не здолее канчаткова разабрацца ў асаблівасцях псіхалагічнага мыслення. Такім чынам, атрымлівалася, што псіхолаг можа быць урачом, а ўрач не можа быць псіхолагам. Такая алагічнасць ледзь не прывяла да закрыцця і ліквідавання медыка-псіхалагічнага факультэта. Але дзякуючы агульным намаганням амаль пятнаццацігадовая барацьба за існаванне была выйграна.

З 2006 года медыка-псіхалагічны факультэт узначаліла Карпюк Валянціна Аляксееўна. Факультэт аб’ядноўвае шэсць кафедр: медыцынскай псіхалогіі і псіхатэрапіі, неўралогіі, псіхіятрыі з курсам агульнай псіхалогіі, факультэцкай тэрапіі, хірургічных хвароб №2 з курсам уралогіі, медыцынскай рэабілітацыі і немедыкаментознай тэрапіі. На кафедрах працуюць 40 выкладчыкаў. З іх:

- дактароў навук – 8 (у тым ліку прафесароў – 7);
- кандыдатаў навук – 20 (у тым ліку дацэнтаў – 12);
- асістэнтаў, выкладчыкаў без ступені – 12.

Нельга не адзначыць і яшчэ аднаго чалавека, без якога стабільная праца дэканата медыка-псіхалагічнага факультэта была б фактычна паралізавана. Гэта Алена Іванаўна Несцерава – сакратар дэканата. На медыка-псіхалагічным факультэце яна працуе з 1998 года. І цяперашні год для яе юбілейны. Кожны студэнт, кожны выкладчык МПФ ведае, што заўсёды знойдзе ў Алены Іванаўны і шчырую дапамогу, і добрую параду, і бадзёрае слова. І хочацца пажадаць её моцнага здароўя і далейшай плённай працы на нашым факультэце.

Кафедрамі факультэта выдадзены 14 вучэбна-метадычных дапаможнікаў. У тым ліку курсаў лекцый – 12. Падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў з грыфам МА РБ – 5. Падручнік па псіхіятрыі з грыфам ВМА медыцынскіх вну Расіі, аўтар Сргей Генадзевіч Обухаў. На факультэце фунцыянуе 8 электыўных курсаў.

Сёння мэтазгоднасць існавання факультэта ўжо не выклікае ні ў каго сумнення. Больш таго, у рэспубліцы назіраецца вялікая запатрабаванасць на нашых выпускнікоў. Такая з’ява тлумачыцца шэрагам прычын: недахоп спецыялістаў у псіхіятрычнай службе Беларусі, так як значная колькасць працуючых у гэтай галіне пенсійнага і перадпенсійнага ўзросту. Нельга не адзначыць і набліжэнне нашай псіхіятрыі да сусветных стандартаў, а таму зусім інакш сталі разглядацца псіхічныя расстройствы, іх крыніцы; паступова засвойваюцца біяпсіхасацыяльныя падыходы. І нарэшце, псіхіятрыя – галіна медыцыны, якая найбольш развіваецца ў нашым грамадстве. Як вынік – год ад года павялічваецца набор на першы курс МПФ, а конкурс сярод прэтэндэнтаў самы вялікі ў Гродзенскім медыцынскім універсітэце.

Медыка-псіхалагічнаму факультэту – 15 год! Гэта многа ці мала? Калі разглядаць гады проста як лічбу, дык здаецца і няшмат. Але тая ж статыстыка досыць яскрава гаворыць пра плённасць гэтых гадоў. За 15 гадоў існавання факультэта было зроблена 10 выпускаў студэнтаў (сёлетні выпуск якраз 10) агульнай колькасцю 377 чалавек. З іх:

- Псіхіятры – 203;
- Нарколагі – 63;
- Псіхатэрапеўты – 38;
- Урачы-псіхолагі – 44;
- Дзіцячыя псіхіятры – 4;
- Дзіцячыя псіхіятры-нарколагі – 2;
- Судовыя псіхіятры – 5;
- Клінічная ардынатура – 4;
- Аспірантура – 4;
- Выкладчыкі-стажоры – 3;
- Свабоднае размеркаванне – 7.

Каля 25% выпускнікоў факультэта з’яўляюцца кіраўнікамі структурных падраздзяленяў псіхіятрычных і наркалагічных устаноў аховы здароўя. Два кандыдаты медыцынскіх навук. Чатыры выпускнікі працуюць урачамі за мяжой.

У чэрвені 2008 года 50 выпускнікоў медыка-псіхалагічнага факультэта развітаюцца з родным універсітэтам і займуцца практычнай медыцынай. А ўжо ў верасні гэтага ж года 120 першакурснікаў зоймуць месцы ў прасторных аўдыторыях. І гэта азначае, што жыццё факультэта працягваецца, і наперадзе нас чакаюць новыя юбілей, дасягненні і перамогі.

*Паступіў 27.05.08*